ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

Выдаецца з 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ЧАЦВЕР 8 СНЕЖНЯ 1977 г.

№ 34 (1184)

Цана 2 кап.

## ПА БДУ — Інфармацыя

У Дзень Ракетных войск і артылерыі ў курсантаў Вышэйшага ваеннага інжынернага зенітна - ракетнага вучылішча адбыўся святочны вечар адпачынку, на які былі запрошаны шэфы — студэнты геаграфічнага факультэта БДУ. На вечар прыехалі студэнты I—IV курсаў. Перад моладдзю выступілі ветэраны вайны. З прывітальным словам да курсантаў звярнуўся сакратар камітэта камсамола геафака Л. Гайдукевіч. Ён павіншаваў курсантаў са святам, а таксама расказаў аб жыцці факультэта, працоўным і вучэбным семестры, рабоце камітэта камсамола.

Затым быў дадзен невялікі канцэрт мастацкай самадзейнасці, падрыхтаваны сумеснымі сіламі курсантаў і студэнтаў.

Д. БЫКАВА.

* * *

Студэнты падрыхтоўчага факультэта БДУ правялі святочны вечар, прысвечаны 7-й гадавіне вызвалення Гвінеі ад каланіяльнага прыгнёту.

На вечар былі запрошаны ўсе гвінейскія студэнты, якія навучаюцца ў ВНУ г. Мінска, савецкія студэнты.

А. ГАРАЎСКАЯ.

* * *

Цікавая сустрэча адбылася днямі ў студэнтаў біялагічнага факультэта з замежнымі студэнтамі. Сумесная гутарка на тэму «Правы чалавека ў СССР і капіталістычных краінах» выклікала ажыўленае абмеркаванне. З цікавасцю праслухалі прысутныя даклады Вольгі Філімонавай, студэнткі V курса «Канстытуцыя СССР аб правах чалавека. Правы чалавека ў ЗША, ФРГ, краінах Блізкага Усходу» і студэнта II курса Валерыя Падлісіх «Водгук замежнай прэсы аб прынятай Канстытуцыі СССР».

А пасля выступілі госці: Ваджых Наддэ (Сірыя), Халім Ісмаіл Бадауі (Ліван), Мухамед Давары Іса і Касем Мухамед аль-Хайдар (Афганістан). Яны расказалі аб тым, што ў іх на радзіме свабода асобы і правы чалавека ажыццяўляюцца ў значна меншай ступені. Там яшчэ не вырашаны праблемы гарантыі працы і жылля, пенсійнага забеспячэння працоўных. Шмат трэба яшчэ зрабіць у галіне народнай асветы, медыцынскага абслугоўвання і інш. Перад краінамі, якія нядаўна вызваліліся ад каланіяльнай залежнасці і толькі выбіраюць шлях развіцця, стаіць шмат жыццёва важных пытанняў.

Л. ПАЎЛЮЧЫК.

* * *

На пасяджэнні савета БДУ было разгледжана пытанне «Аб выкананні планаў павышэння кваліфікацыі прафесарска-выкладчыцкага саставу і падрыхтоўкі навукова - педагагічных кадраў. Перспектыва падрыхтоўкі кадраў па новых галінах навукі». З дакладам па гэтаму пытанню выступіў прарэктар па навуковай рабоце, прафесар Л. В. Валадзько.

Быў разгледжан і зацверджан план навукова - даследчых работ на 1978 год. Аб выніках работы падрыхтоўчага аддзялення ў мінулым навучальным годзе, рабоце дэканатаў фізічнага і механіка-матэматычнага факультэтаў з выпускнікамі падрыхтоўчага аддзялення савету далажыў загадчык падрыхтоўчага аддзялення А. І. Кажушкоў (садакладчыкі А. С. Фядэнка і А. А. Чупрыгін).

Л. АНДРЭЕВА.

## КП

## ПАЧАТАК ЁСЦЬ!

Адбылося другое пасяджэнне штаба «Камсамольскага пражэктара» універсітэта, на якім пражэктарысты абмеркавалі сваю работу ў кастрычніку-лістападзе гэтага навучальнага года.

Першым выступіў прадстаўнік факультэта журналістыкі А. Крыж. Ён коратка і змястоўна расказаў аб сённяшніх справах «КП» журфака, падмацоўваючы свае думкі фактамі і дакументацыяй. За мінулы час на факультэце выпушчана 6 нумароў «Камсамольскага пражэктара» і адна «маланка». Тэматыка іх самая разнастайная: наведванне студэнтамі заняткаў і ліквідацыя акадэмічных запазычанасцей, пасвячэнне першакурснікаў у студэнты і агляд санітарнага стану інтэрнатаў. Праведзены 24 рэйды - праверкі ў аўдыторыях факультэта і 2 — у інтэрнатах № 2 і № 5.

Далей А. Крыж адзначыў, што галоўная ўвага звяртаецца пражэктарыстамі журфака на дзейснасць выступленняў, рэагаванне на іх адпаведных арганізацый. Матэрыялы аб выніках рэйдаў накіроўваюцца ў дэканат, камітэт камсамола, студсавет. І вынікі пачынаюць акрэслівацца: палепшылася наведванне студэнтамі заняткаў, значна палепшыўся санітарны стан у інтэрнатах.

Дарэчы, работа пражэктарыстаў журфака прызнана адной з лепшых ва універсітэце.

Сярод астатніх вылучаецца «Камсамольскі пражэктар» факультэта прыкладной матэматыкі. Тут выдадзены цікавыя нумары аб выніках восеньскага кросу, наведванні студэнтамі-матэматыкамі заняткаў. Сумесна са студсаветам члены «КП» правялі рэйд у інтэрнаце № 6, дзе азнаёміліся з тым, як праводзяць студэнты свой вольны час. Як выявілася з рэйду будучых юрыстаў, гэта праблема яшчэ не поўнасцю вырашана і ў інтэрнаце № 4. Акрамя таго, студэнты скардзяцца, што рамонт пачынаюць там сярод навучальнага года. Усе скаргі пражэктарысты накіравалі на рэагаванне ў партыйнае і прафсаюзнае бюро факультэта.

Толькі адзін нумар газеты выпусцілі члены «КП» геаграфічнага факультэта. Сёлета ў яго саставе працуюць студэнты малодшых курсаў, якім, зразумела, яшчэ не хапае адпаведнага вопыту.

Работы наперадзе шмат. Пажадаем новым саставам факультэцкіх «Камсамольскіх пражэктараў» — па-новаму — горача і натхнёна — аднесціся да сваёй адказнай справы.

Л. АСТАПОВІЧ.

* * *

**САСТАЎ ШТАБА «КАМСАМОЛЬСКАГА ПРАЖЭКТАРА» БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА.**

Старшыня — Г. Ільяшчук, аспірантка кафедры гісторыі КПСС гуманітарных факультэтаў;

намеснік старшыні — А. Аладзін, студэнт II курса гістарычнага факультэта аддзялення філасофіі;

сакратар — Т. Бяліцкая, студэнтка III курса факультэта журналістыкі;

члены штаба — Л. Астаповіч, студэнтка III курса факультэта журналістыкі (сектар галоснасці); А. Барэцкі, студэнт IV курса юрыдычнага факультэта (сектар быту); А. Дашуцін, студэнт IV курса фізічнага факультэта (арганізацыйны сектар); А. Пудаў, студэнт II курса гістарычнага факультэта (вучэбна-выхаваўчы сектар); А. Трале, студэнт III курса механіка-матэматычнага факультэта (арганізацыйны сектар); Г. Шукайла, студэнтка II курса геаграфічнага факультэта (сектар быту).

**У адпаведнасці з палажэннем аб аглядзе-конкурсе на лепшую навуковую работу маладых вучоных БДУ імя У. І. Леніна ад 25 красавіка 1974 года для падвядзення вынікаў агляду-конкурсу створана камісія ў наступным саставе:**

Л. В. Валадзько (старшыня), прарэктар па навуковай рабоце, акадэмік;

Т. М. Пушкарова (намеснік старшыні), старшыня савета маладых вучоных, кандыдат хімічных навук;

А. А. Тозік, сакратар камітэта камсамола, кандыдат гістарычных навук;

А. С. Ключнікаў, намеснік дырэктара па навуковай рабоце НДІ ПФП, кандыдат фізіка-матэматычных навук;

Г. А. Мядзведзеў, загадчык кафедры тэорыі верагоднасцей і матэматычнай статыстыкі, прафесар;

Д. Б. Мельцар, в. а. прафесара кафедры гісторыі БССР, доктар гістарычных навук;

А. Ц. Пікулеў, загадчык кафедры біяхіміі, прафесар;

А. М. Саржэўскі, загадчык кафедры агульнай фізікі, прафесар;

Р. Л. Старобінец, загадчык кафедры аналітычнай хіміі, прафесар;

В. І. Сцяпанаў, загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі прыродазнаўчых факультэтаў, прафесар;

Б. В. Стральцоў, загадчык кафедры тэорыі і практыкі савецкай журналістыкі, прафесар;

А. Я. Супрун, загадчык кафедры агульнага і славянскага мовазнаўства, прафесар;

А. С. Фядэнка, загадчык кафедры геаметрыі, прафесар;

В. Ф. Чыгір, загадчык кафедры грамадзянскага права і працэсу, прафесар;

В. Ф. Якушка, загадчык кафедры агульнага земляробства, прафесар;

У. В. Ізох, загадчык кафедры радыёфізікі і электронікі ЗВЧ, прафесар.



Клас эксперыментальна-вылічальнай навучальнай сістэмы БДУ. Падрабязней чытайце аб гэтым на 2—3 старонках.

Фота В. ДРАЧОВА.

Нам пішуць

## ТАВАРЫСКІЯ АДНОСІНЫ

**Дырэктар секцыі матэматыкі Іенскага універсітэта імя Ф. Шылера прафесар Г. Шлосэр у сваім пісьме, адрасаваным прарэктару па вучэбнай рабоце БДУ А. Я. Малышаву і дэкану факультэта прыкладной матэматыкі Я. А. Іванову, піша:**

— Ад імя дэлегацыі студэнтаў секцыі матэматыкі Іенскага універсітэта і яе кіраўнікоў дактароў Д. Коха і Х. Мендэ, якія сёлета былі на практыцы ў БДУ імя У. І. Леніна, я выражаю вялікую падзяку савецкім таварышам за тое, што яны далі магчымасць нямецкім студэнтам паспяхова прайсці практыку, а таксама наведаць гарады-героі Брэст, Ленінград, Маскву, азнаёміцца з памятнымі мясцінамі Мінска.

Секцыя матэматыкі Іенскага універсітэта вельмі зацікаўлена ў пашырэнні і паглыбленні навуковых кантактаў з БДУ. Асабліва нас цікавіць вопыт Вашай ВНУ ў галіне вылічальнай тэхнікі і прыкладной матэматыкі. Мы таксама зацікаўлены ў абмене навуковымі работамі студэнтаў і іншымі публікацыямі. Для расшырэння кантактаў мы лічым неабходным таксама ўмацаванне сувязей з грамадскімі арганізацыямі БДУ.

У верасні 1977 года ў Іенскім універсітэце праходзілі практыку студэнты факультэта прыкладной матэматыкі БДУ. Мы пастараліся аказаць савецкім студэнтам усякае садзейнічанне для паспяховага яе правядзення.

У праграму, якая была поўнасцю выканана, было ўключана азнаямленне з Іенскім універсітэтам, метадамі навучання. Акрамя гэтага, савецкія студэнты змаглі наведаць мемарыял былога канцлагера Бухенвальд, Лейпцыгскі кірмаш, гарады Веймар, Эрфурт, Дрэздэн, Заальфельд, Рудольфштат, Патсдам, Берлін.

Паспяховае выкананне праграмы стала магчымым дзякуючы глыбокаму разуменню і даверу, якія савецкія студэнты і іх кіраўнікі праявілі ў адносінах да нямецкіх студэнтаў і супрацоўнікаў секцыі матэматыкі.

Ад імя навуковых супрацоўнікаў і студэнтаў секцыі матэматыкі Іенскага універсітэта і ад сябе асабіста я перадаю сардэчныя прывітанні савецкім таварышам, жадаю ім у год 60-годдзя Вялікага Кастрычніка вялікіх поспехаў і спадзяюся, што нашы таварыскія адносіны і надалей будуць мацнець і развівацца.

Г. ШЛОСЭР, прафесар, доктар.

# ІДЗЕ ПОШУК

Факультэт прыкладной матэматыкі быў створан у 1970 годзе. Яго стварэнне было звязана з пэўнымі цяжкасцямі. У той час у краіне налічвалася ўсяго некалькі такіх факультэтаў. Не быў выпрацаван адзіны навучальны план для ФПМ. Толькі 2 гады назад гэты план пачаў укараняцца ў вучэбны працэс. На пытанні, звязаныя са зменамі, якія адбыліся на факультэце прыкладной матэматыкі ў сувязі з увядзеннем новага тыпавога плана, адказвае дэкан факультэта Яўген Аляксеевіч Іваноў.

**— У чым заключаецца сутнасць новага плана?**

— Самае галоўнае тое, што было дакладна вызначана кола дысцыплін спецыялізацый, вывучэнне якіх дазваляе рыхтаваць спецыялістаў па прыкладной матэматыцы, веды якіх адпавядалі б сучасным патрабаванням тых галін народнай гаспадаркі, дзе нашы выпускнікі будуць працаваць. Важнейшыя са спецыялізацый — спецыялізацыі па матэматычнаму забеспячэнню ЭВМ і па матэматычнаму забеспячэнню АСК (аўтаматычных сістэм кіравання). Народная гаспадарка не толькі нашай рэспублікі, але і ўсёй дзяржавы ў цэлым мае патрэбу у спецыялістах такога профілю.

На факультэце ўведзены спецлабараторныя работы і спецпрактыкумы на ЭВМ па прадметах спецыялізацый, а таксама некаторыя спецдысцыпліны, вывучэнне якіх строга абавязкова.

**Якія канкрэтныя змены адбыліся ў праграмах курсаў?**

— Навучальная праграма абноўлена на ўсіх курсах. Асабліва відавочны гэтыя змены ў выпускнікоў. Раней праграма пятага года навучання не была канкрэтнай. Студэнты праходзілі вытворчую практыку і адначасова слухалі лекцыі па спецдысцыплінах. Гэта было вельмі нязручна. Атрымлівалася так, што студэнтамі дрэнна засвойваліся тэарэтычныя матэрыялы па спецдысцыплінах.

Зараз пяты год навучання выразна падзяляецца на тры перыяды. З 1 верасня па 7 лістапада — аўдыторныя заняткі, на якіх заканчваецца вывучэнне тэарэтычных дысцыплін па спецыялізацыі, праводзяцца спецлабараторныя і спецсемінарскія заняткі.

Наступны перыяд — праходжанне вытворчай практыкі са снежня і да сакавіка. І, нарэшце, — напісанне дыпломных работ (сакавік-май). Студэнты фактычна пачынаюць працаваць над дыпломам ужо ў час праходжання вытворчай практыкі.

**— Раскажыце аб рабоце, якая вядзецца супрацоўнікамі факультэта па ўдасканаленню навучальнага працэсу?**

— Многія супрацоўнікі факультэта з'яўляюцца аўтарамі праграм па раду вучэбных дысцыплін, членамі навукова-метадычнага савета па прыкладной матэматыцы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР (універсітэцкая секцыя) і працуюць па плану гэтага савета.

Вядзецца работа па ўдасканаленню спецкурсаў, абавязковых для нашых спецыялізацый. Над гэтымі праграмамі працуюць супрацоўнікі кафедр матэматычнага забеспячэння аўтаматызаваных сістэм кіравання, матэматычнага забеспячэння ЭВМ, агульнага праграміравання.

У хуткім часе пачне сваю работу спецыяльная нарада навукова - метадычнага савета па прыкладной матэматыцы Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі СССР (універсітэцкая секцыя) па абмеркаванню праектаў праграм гэтых спецкурсаў.

Гутарку вяла
**Т. ШУЛЬГА.**

---

**АРТЫКУЛ 40.** Грамадзяне СССР маюць права на працу, — гэта значыць на атрыманне гарантаванай работы з аплатай працы ў адпаведнасці з яе колькасцю і не ніжэй устаноўленага дзяржавай мінімальнага размеру, — уключаючы права на выбар прафесіі, роду заняткаў і работы ў адпаведнасці з прызваннем, здольнасцямі, прафесіянальнай падрыхтоўкай, адукацыяй і з улікам грамадскіх патрэбнасцей...

**АРТЫКУЛ 45.** Грамадзяне СССР маюць права на адукацыю.

Гэта права забяспечваецца бясплатнасцю ўсіх відаў адукацыі, ажыццяўленнем усеагульнай абавязковай сярэдняй адукацыі моладзі, шырокім развіццём прафесіянальна-тэхнічнай, сярэдняй спецыяльнай і вышэйшай адукацыі на аснове сувязі навучання з жыццём, з вытворчасцю; развіццём завочнай і вячэрняй адукацыі: прадастаўленнем дзяржаўных стыпендый і льгот навучэнцам і студэнтам...

Гэтыя артыкулы Канстытуцыі адносяцца непасрэдна да цябе, сённяшні студэнт.

Якім ты прыйдзеш у заўтрашні дзень, малады спецыяліст? Над гэтым пытаннем разважаюць нашы аўтары.

# Крокі ў лабірынты формул

Прызванне... Некаторыя вызначаюць яго для сябе яшчэ на школьнай лаўцы. Для тых, хто вельмі зацікавіўся матэматыкай, ужо больш дзесяці год існуе пры БДУ імя У. І. Леніна на базе механіка - матэматычнага факультэта школа юных матэматыкаў.

У школе тры класы: адзін дзевяты і два дзесятыя. Штогод сюды набіраюць сто чалавек, але жадаючых займацца звычайна ў два-тры разы больш. Даводзіцца рабіць уступныя экзамены, так што папасці ў лік «выбраных» могуць, канешне, толькі самыя падрыхтаваныя, самыя здольныя.

Андрэй Вялеська — выпускнік школы юных матэматыкаў. Ён займаўся ў ёй два гады. Зараз Андрэй — студэнт першага курса механіка - матэматычнага факультэта. На пытанне, што дала яму школа, Андрэй адказаў так:

— Па-першае, гэта былі сустрэчы з сапраўднай навукай на цікавых лекцыях нашых выкладчыкаў. Па-другое, веды мае ў галіне матэматыкі значна паглыбіліся і сістэматызаваліся. Для тых, хто па-сапраўднаму захоплен матэматыкай, заняткі ў школе — вельмі сур'ёзны і адказны этап.

Давайце адчынім дзверы 358-й аўдыторыі. Зараз тут займаецца дзевяты клас.

...Цішыня. Толькі што М. В. Мілаванаў закончыў тлумачэнне новай тэмы. На дошцы запісана ўраўненне. Галовы рабят нізка схіліліся над партамі. Усе захоплены пошукам рашэння. Нехта таропка піша ў сшытку лічбы, відаць, прыйшла нейкая ідэя. А нехта бязлітасна грызе кончык ручкі, яшчэ не заўважаючы сярод каварных лабірынтаў формул таго, аднаго-адзінага правільнага шляху, які павінен прывесці да мэты...

Ужо чатыры гады з'яўляецца дырэктарам школы юных матэматыкаў Міхаіл Васільевіч Мілаванаў. За гэтыя гады праз яго рукі прайшло шмат юных талентаў. Але далёка не ўсе рабяты, якія займаюцца ў школе, становяцца студэнтамі мехмата (паступае ў БДУ адзін з пяці, як гаворыць статыстыка). Але ж галоўная задача школы зусім не ў падрыхтоўцы будучых студэнтаў для факультэта. Галоўнае — паглыбіць і расшырыць веды старшакласнікаў у галіне матэматыкі, навучыць іх мысліць, развіваць здольнасці да матэматычнага аналізу.

Займацца ў школе нялёгка. І не ўсе з прынятых у лік вучняў даходзяць да «выпуску». Справа ў тым, што праграма навучання патрабуе вялікай самастойнай творчай работы. А з гэтым не кожны справіцца.

— Работа са школьнікамі — справа вельмі цяжкая і тонкая. Выкладчык павінен даваць матэрыял даступна, цікава, словам, так, каб рабяты, якія займаюцца ў нас, з ахвотай ішлі на кожны ўрок, як на сустрэчу з чымсьці незвычайным, таямнічым, якое ўрэшце становіцца блізкім і зразумелым, — расказвае Міхаіл Васільевіч.

— Калі школьнік будзе добра засвойваць школьны курс і рэгулярна наведваць нашы заняткі, — працягвае ён, — то к канцу навучання ў школе юных матэматыкаў ён зможа, базіруючыся на ведах, якія атрымае ў нас, вывесці тры славутыя законы Кеплера з закона сусветнага прыцягнення. Законы Кеплера! Гэта ж велізарная справа!

У гэты час аўдыторыя ажыўляецца. Рабяты параўноўваюць адказы, абгрунтоўваюць свае спосабы рашэння.

— Хто ўжо рашыў? — пытаецца выкладчык.

Цягнуцца ўверх рукі.

...Іх мара — матэматыка. Магчыма, сярод рабят у гэтай аўдыторыі сядзіць новы Келдыш ці Лабачэўскі. Але не будзем загадваць. Усё для іх яшчэ наперадзе.

**В. ШАЛІЎСКАЯ.**



Клас эксперыментальна-вылічальнай навучальнай сістэмы БДУ запоўнілі студэнты І курса хімфака. Падгрупа ў 15 чалавек прыступіла да выканання з дапамогай ЭВМ кантрольнай работы.

На невялікім экране перад адным са студэнтаў паяўляюцца зялёныя літары: «Свірыдаў Дзм., ваша кантрольная работа пачалася ў 16 гадзін, прыступайце да рашэння першай задачы». Затым «загараюцца» ўмовы першай задачы. У класе ўсталёўваецца цішыня. Толькі зрэдку пашчоўкваюць кнопкі пульта. Наперадзе паўтары гадзіны нялёгкай працы, паўтары гадзіны дыялогу з машынай.

Уважліва сочыць за ходам работы асістэнт кафедры агульнай хіміі і методыкі выкладання хіміі Г. А. Ка-





У чытальнай зале БДУ. Фота В. МІХАЕВІЧ.

# ГРАНІТ НАВУКІ ЦВЁРДЫ

Галоўная задача студэнта — вучоба. Але ці ўсе ўмеюць вучыцца? Што патрэбна для паспяховай вучобы, каб не было штурмаўшчыны ў падрыхтоўцы да экзаменаў, каб не давялося чырванець на вытворчай практыцы за сваю неадукаванасць?

Аб гэтым маналог выдатніцы вучобы, пяцікурсніцы гістарычнага факультэта Людмілы Валюк:

**Вучыцца толькі для таго, каб быць выдатнікам,— пра гэта і размовы быць не можа. Лічу, што галоўнае — не адзнака, а грунтоўныя, поўныя веды. І пра гэта нельга забываць на працягу ўсёй вучобы.**

**Складаемыя выдатнай вучобы...**

**Жаданне. Гэта першае і асноўнае. Далей, імкненне ведаць як мага больш. Не абмяжоўвацца матэрыялам, які прапаноўвае выкладчык, а больш настойліва займацца самастойна, шмат чытаць дадатковай літаратуры, імкнуцца выпрацаваць свой погляд, мець заўсёды асабістую думку. Ніякай карысці не дае завучванне кнігі радка ў радок. Трэба зразумець матэрыял, прапусціць яго праз прызму свайго светаўспрымання. На дасягнутым не спыняцца, а ўвесь час — наперад, наперад...**

**У студэнтаў адвечная праблема — недахоп часу. Падоўжыць бы суткі на некалькі гадзін! Раблю ўсё магчымае, каб кожная хвіліна была выкарыстана рацыянальна, прадумана.**

**Вучобу неабходна спалучаць з грамадскай дзейнасцю. Толькі ў рабоце прыходзіць уменне працаваць з людзьмі, што абавязкова спатрэбіцца ў будучым. Грамадская работа дапамагае лепш вучыцца. Гэта мае асабістае меркаванне. Яно — вынік жыццёвых назіранняў. Я з'яўляюся намеснікам сакратара камсамольскай арганізацыі факультэта па акадэмічнай рабоце, адказная за работу вучэбна-выхаваўчай камісіі гуманітарных факультэтаў ва універсітэце. Не толькі не скарджуся на загружанасць, а наадварот, не ўяўляю сябе без гэтага.**

Маналог запісала
**Г. МАЛАХОЎСКАЯ.**

жушкоў. Асноўныя цяжкасці ўжо пераадолены: складзена і адладжана праграма, усё гатова да заняткаў. Цяпер ЭВМ сама будзе весці работу, сама ж і выставіць адзнаку.

Генадзь Анатольевіч гаворыць:

— Клас ЭВНС працуе ў нас з 1975 года, кіруе ім кафедра вылічальнай матэматыкі. Поспех гэтай сістэмы навучання, несумненна, вялікі. Машыны хутка і дакладна праводзяць калёквіум са студэнтамі. Цяжка ўявіць, колькі б часу пайшло на тое, каб з кожным правесці гэтую работу.

Безумоўна, нямала сіл і энергіі ідзе на складанне праграмы, але ўсё гэта кампенсуецца. Практычна заняткі ў класе ЭВНС можна праводзіць са студэнтамі ўсіх факультэтаў, па ўсіх дысцыплінах. І можна з упэўненасцю сказаць, што за такім спосабам навучання — будучыня. Але вернемся ў клас ЭВНС.



# ЗНАЁМЦЕСЯ: ЭВНС



Прайшло 15 хвілін кантрольнай работы. Дзіма Свірыдаў рашыў ужо тры задачы. На экране — умова чацвёртай. Дзіма задаволен заняткамі на ЭВМ:

— Выконваць работу даволі цікава. Машына дапамагае табе праводзіць усе вылічэнні, адказвае, ці правільна ты рашыў задачу. У нас ужо праводзілася такая кантрольная работа, атрымаў чацвёрку.

А вось Наталля Сычукова крыху адстае. Яна рашыла пакуль толькі адну задачу. У кожнага са студэнтаў яны розныя, і таму «падглядзець» у суседа ход рашэння – нельга.

І вось кантрольная работа падышла к канцу. «Работа закончана ў 17.30 пры адзнацы «добра»... пры адзнацы «выдатна», — падводзіць машына вынікі працы кожнага са студэнтаў.

Дрэнных адзнак няма. Выкладчык задаволен работай групы.

**В. ЧАРНУШЭНКА.**

***

**На экране машыны—умовы першай задачы. У класе ЭВНС усталёўваецца цішыня. Пачаліся заняткі ў студэнтаў II курса фізічнага факультэта.**

**Фотарэпартаж В. ДРАЧОВА, В. МІХАЕВІЧ.**



# НАСТАЎНІК — ПРАФЕСІЯ ТВОРЧАЯ

...Першым у клас залятае звычайны вучнёўскі партфель. За ім, напэўна, яго ўладальнік— жвавы, узлахмачаны падлетак год дванаццаці. А следам — гурт такіх жа ўзбуджана-хуткіх і гаманлівых хлопчыкаў і дзяўчынак. Славуты ў школе «цяжкі» 6-ы «Б» з'явіўся на ўрок біялогіі. Яны ніяк не могуць знайсці кожны сваё месца нават пасля званка. Маладзенькая настаўніца ў роспачы — бягуць дарагія хвіліны ўрока. Нарэшце ў класе ўсталёўваецца нешта падобнае на цішыню, і пяцікурсніца біяфака Люся Аўгуль пачынае пяты ў сваім студэнцкім жыцці ўрок.

«Няўжо не здолею зацікавіць іх?» — пытае сябе дзяўчына. І вырашае: павінна зацікавіць! Упэўненасць гэтая — на Люсіным твары, у простай добразычлівай усмешцы, у голасе, у якім — ані ноткі хвалявання (ці то здаецца?), толькі раз сарвауся—на кароткае імгненне — ад нейкай крыўды на непаслухмяных гэтых шасцікласнікаў. Адразу ж спахапілася: завошта ж на іх крыўдаваць, мо на сябе лепш? Спрабуе зноў заваяваць поўную ўвагу класа. Знянацку кінутыя словы: «А вось гэтага вы не прачытаеце ў падручніку...» прымушаюць дзяўчынак і хлопчыкаў падняць на настаўніцу цікаўныя позіркі. Цікаўнасць у дзіцячых вачах паступова змяняецца здзіўленнем: аказваецца, і водарасці—дзіўны свет! Надзея і ўпэўненасць Люсіны растуць з кожным імгненнем. Яна спрабуе зрабіць са звычайнага тлумачэння новага матэрыялу—размову. Павольна праходзіць паміж радамі, з захапленнем расказвае. «А вось гэта вы, напэўна, ведаеце. Хто мне дапаможа?»—пытае ў класа. У адказ—адзіны парыў дзесятка рук...

***

— Люся, — пытаюся пасля ўрока, — якіх ты вучняў больш за ўсё любіш?

— Дысцыплінаваных, — уздыхнуўшы, адказвае дзяўчына. Толькі цяпер відаць, як напружана адчувала яна сябе на ўроку. — Калі вучань умее слухаць, я змагу даць яму больш ведаў. А гэта мая асноўная мэта.

Да размовы далучаюцца Люсіны аднакурсніцы, што разам з ёю праходзяць педпрактыку ў 44-й мінскай школе, — Рыма Жалдакова і Галя Гарэльская.

— Галоўнае — стварыць на ўроку атмасферу агульнай зацікаўленасці. Што я пад гэтым разумею? Не толькі цікаўныя вочы. Трэба, каб вучні слухалі і тлумачэнні настаўніка, і адказы сваіх сяброў — трэба навучыць іх берагчы час урока, каб ён не праходзіў марна ў паўторах і таптанні на адным месцы. І яшчэ — я люблю вучнёўскія пытанні. Адчуваю сябе здольнай адказаць амаль на любое з іх. І наогул, калі пытанні ўзнікаюць — значыць штосьці з урока вучні вынесуць.

Так лічыць Рыма.

— А я пытанняў крыху баюся,—прызнаецца Галя. — Правільней, не саміх пытанняў, а таго, ці змагу я адказаць на іх зразумела. Бо калі зразумела— гэта і значыць цікава. Зрабіць урок цікавым — залежыць толькі ад настаўніка. Таму нават у звычайнай тэме хочацца знайсці тую «іскрынку», што зацікавіць вучняў. Пры падрыхтоўцы да ўрока прачытаеш яшчэ шмат чаго, акрамя падручнікаў.

Далей у сваёй размове дзяўчаты закранаюць пытанне, ці ёсць на школьным уроку месца для творчасці. І ў чым яна, творчасць настаўніка?

— Кожны ўрок як бы ўяўляеш сабе пры падрыхтоўцы,— гаворыць Люся Аўгуль. — У гэтым своеасаблівы момант творчасці. Я люблю, калі потым ўсё адбываецца па раней задуманаму плану. Тады лепш арыентуешся ў часе, не залежыш ад яго. Ды і наогул не люблю, напрыклад, калі апытанне зацягваецца і не хапае часу на тлумачэнне. А я больш за ўсё люблю тлумачыць новы матэрыял. Тут сапраўднае раздолле творчасці.

— Калі вядзеш запар два ўрокі па адной тэме ў паралельных класах, — гэта ўступае ў размову Галя Гарэльская, — ясней за ўсё разумееш, што такое творчасць настаўніка. Ніколі не атрымліваюцца два аднолькавыя ўрокі. Настаўнік увесь час знаходзіць нешта новае, нейкія дэталі, новыя павароты тэмы. Калі нешта спачатку не ўдалося, імкнешся, каб у наступны раз было глыбей, лепш, цікавей.

— Так. Настаўнік — сапраўды творчая прафесія,—сцвярджае Рыма Жалдакова. — Гэта не проста спецыяліст, скарбніца ведаў у нейкай навуковай галіне, не проста матэматык, фізік, біёлаг. Настаўнік павінен быць тварцом. Чаго? Чалавечых адносін — паміж сабой і вучнямі, паміж самімі вучнямі. Я аб гэтым ужо гаварыла — аб «атмасферы агульнай зацікаўленасці». Кожны дасягае гэтага па-свойму — гэта ўжо закон творчасці.

Аб чым яшчэ гаварылі дзяўчаты? Аб тым, што настаўнік павінен быць асобай, бо дзецям патрэбен аўтарытэт настаўніка. Ён павінен быць шукальнікам — каб здолець павесці ў глыбіні ведаў сваіх вучняў. Настаўнік павінен быць чалавекам, якому вераць.

***

...Пра звычайныя водарасці можна расказваць так:

— Глядзіш на рачную ваду і зусім не звяртаеш увагі на маленькія зялёныя раслінaчкі. А гэта ж цэлы свет...

Так пачаў свой адказ непаседлівы хлапчук з Люсінага класа.

**Т. ЧЫГРЫНАВА.**

**Матэрыялы 2—3 старонак гэтага нумара падрыхтавалі студэнты II курса факультэта журналістыкі.**

# БЫЦЬ ДАСТОЙНЫМ СВАЙГО ЧАСУ

Інтарэс да гісторыі прыйшоў да Анатоля Разанава яшчэ ў школе. З захапленнем чытаў ён літаратуру аб выдатных гістарычных дзеячах, цікавіла гістарычнае мінулае і культура розных народаў.

Паступіў на гістфак і адразу пачаў займацца ў гуртку гісторыі партыі. Іменна гэтыя заняткі навучылі Анатоля самастойна працаваць над літаратурай. Ён з вялікай зацікаўленасцю падрыхтаваў работу «Барацьба камуністычнай партыі Вялікабрытаніі за адзінства працоўнага класа». Зараз яна прадстаўлена на рэспубліканскі конкурс студэнцкіх навуковых работ па гуманітарных навуках. Наперадзе — дыпломная на гэтую ж тэму, але работы над ёй, на думку Анатоля, яшчэ шмат. Прынцыпы работы: не спыняцца на дасягнутым, кожны дзень ісці хоць крыху да мэты, шукаць нешта новае. Працу над сваёй тэмай Анатоль пачаў яшчэ на трэцім курсе.

— Большую частку свабоднага часу праводзіў у бібліятэках. Іншы раз цягнула заняцца чым-небудзь іншым, але прыходзілася прымушаць сябе займацца неабходнай справай. Потым праца стала патрэбай. Зараз Анатоль перапрацоўвае шмат літаратуры па тэме, праглядае штодзённы англійскі друк.

У аснове яго навуковай працы — праблема супрацоўніцтва камуністычнай партыі Вялікабрытаніі і лейбарысцкай партыі. Іменна ад узаемаадносін гэтых дзвюх партый у велізарнай ступені залежыць поспех барацьбы за адзінства рабочага класа краіны. Разам з тым неабходна было разгледзець і пытанне барацьбы кампартыі Вялікабрытаніі за адзінства прафсаюзнага руху.

...Пастаянная патрабавальнасць да сябе, творчы падыход да кожнага пытання — якасці, так неабходныя сёння маладому спецыялісту, сталі неад'емнай рысай характару Анатоля Разанава. Мабыць, гэта і ёсць галоўны вынік самастойнай працы над сабой.

А дзе знайсці ў такім выпадку час на грамадскую работу? — спытаеце вы.

У нядаўнім мінулым Анатоль — намеснік сакратара камітэта камсамола факультэта па ідэалагічнай рабоце. Пазіцыя яго такая: чым раней атрымаеш навыкі грамадскай работы, тым лягчэй будзе працаваць з людзьмі...

Якім ты прыйдзеш у заўтрашні дзень, малады спецыяліст? Твае веды, уменне працаваць з людзьмі так патрэбны Радзіме. Ты разважаеш над гэтымі хвалюючымі для кожнага пытаннямі, разумееш, якія вялікія патрабаванні стаяць сёння перад табой.

Актывіст, выдатнік, імянны стыпендыят — ён атрымлівае стыпендыю імя К. Маркса, — Анатоль Разанаў імкнецца быць дастойным свайго часу.

**З. ЯНОВІЧ.**

